Цана асобнага нумару 250.000 м.

Сын Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3.000000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 400.000 мк., сярод тэксту 300.000 м. і на 4 стр. 250.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 1. Вільня, Нядзеля, 18-га травеня 1924 г. Год I.

АГУЛЬНЫ СХОД
Таварыства Беларускае Школы.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада паведамляе ўсіх сяброў Т-ва Беларускай Школы, што агульны сход Т-ва **адбудзецца 24 траўня г. г.** ў Вільні, Віленская вул. № 12, кв. 6 а **4 гадз. дня**. Пры гэтым папераджаецца, што калі ня прыбудзе на сход акрэсьленае статутам лічбы сяброў, дык сход, на моцы § 34 статуту, адбудзецца **7-га чэрвеня г. г.** ў тым самым памешканьні і гадзіне пры ўсякай лічбе прыбыўшых сяброў.

Парадак дня: 1) Зацьверджаньне зьменаў у статуце і 2) Бягучыя справы.

Замежная дапамога.

Усім вядома, які вялізарны ўплыў на Польшчу мае Францыя.

Уплыў гэны грунтуецца на тым, што Францыя забясьпечывае Польшчы абарону яе незалежнасьці. Але гэтая „ласка"—не дармовая: бо за гэта Польшча прымушана дзяржаць вялікую армію, гатовую ў кожнай прыгодзе стануць поплеч з французкай.

Ясна, што Францыя зацікаўлена ў тым, каб Польшча была магчыма дужэйшая, каб больш войска магла пасlаць на падмогу сваей саюзьніцы. Але ў Францыі дагэтуль панаваў свой францускі „хіена-пяст": там у парляманце меў большасьць так-званы „нацыянальны блёк"—значыць, хаўрус партый, якія баранілі карысьць капіталістаў, фабрыкантаў, вялікіх абшарнікаў, кажучы, што гэта—апора нацыі і дзяржавы. Нацыянальны блёк утварыў урад, на чале якога паставіў бышага прэзыдэнта Францыі, Пуанкарэ.

Палітыка Пуанкарэ у Францыі давяла да таго, да чаго давёў Польшчу Вітас і эндэцкі ўрад: да страшэннае дарагоўлі, зьбядненьня працоўнага народу і ўпадку цэннасьці грошы. Пуанкарэ, родны брат польскіх нацыяналістаў, падтрымліваў і ў Польшчы палітыку уціску „нацыянальных меншасьцяў", спадзяючыся, што палякі хутка здолеюць перарабіць беларусаў, украінцаў і другіх у палякоў, ды тады Польшча станецца запраўды моцнай, бо ў ёй будуць адны палякі.

Ведама, гэткія мяркаваньні — сьмешныя па сваёй наіўнасьці. Іх зьдзейсьніць нельга, бо у нашы часы нельга проста выразаць „інародцаў", як некалі—ў даўныя часы—рабілі немцы з славянскімі пляменьнямі, займаючы іх землі. І палітыка, якую ў адносінах да сваіх „меншасьцяў" вядзе Польшча з благаславенства Пуанкарэ, не даляла нічога, а толькі нашкодзіла Польшчы ў яе замежнай палітыцы, аслабіўшы яе і ўнутры. Вось жменя фактаў.

„Dziennik Wileński" піша, што ў нямецкай газэце „Deutsche Allgemeine Zeitung", што выходзе ў Бэрліне, надрукована стацьця, у якой зьмешчаны вострыя напасьці на Польшчу за зьдзекі над палітычнымі вязьнямі, асабліва над беларусамі.

Той-жа „Dziennik Wil." паказывае, што замежныя беларусы зьвярнуліся да англійскага прэм'ера Мак-Данальда з просьбай аб абарону уціsканых беларусаў у Польшчы.

З пратэстам проці польскае палітыкі выступіў у спэцыяльнай ноце і Чычэрын ад імя СССР.

Урэшце, як піша „Kurjer Poranny", проці таго, што дзеецца ў Польшчы, паўсталі і *францускія* сацыялісты. Напярэдадні польскага нацыянальнага сьвята 3 мая ў парыжскіх газэтах зьявіўся *пратэст проці „белага тэрору ў Польшчы"*. „Тэкст гэтага дакумэнту,—піша „Kur. Por.",—пасьля кароткага ўступленьня аб „дзікіх гвалтах" наагул, аб зачыненьні газэт, закрываньні таварыстваў моладзі, выкіданьні на брук работніцкіх арганізацыяў, выступае асабліва проці пануючых у Польшчы *парадкаў*, ці, як хоча, *непарадкаў у вастрогах*. „У вастрогах Польскае Рэспублікі знаходзіцца цяпер больш за 3.000 палітычных вязьняў—работнікаў за ўчасьце ў забастоўках, украінскіх і беларускіх сялян, жадаючых нацыянальнае незалежнасьці, інтэлігенцыі, якая вінавата тым, што арганізуе асьвету сярод народу. Церпючы зьдзек ад вастрожных старажоў, лаяныя, бітыя рэмнямі і палкамі, кормленыя выключна буракамі, у смуродзе, седзячы разам з звычайнымі зладзеямі, ў вопратках прагнійшых ад бруду, у сьцюдзёных і сырых камэрах, пазбаўленыя мыла, бялізны, кніг, адведзін сваякоў, — гэтыя вязьні часта лепш выбіраюць самагубства, чым павольнае кананьне, — дый не заўсёды павольнае, бо вось у справе Вольгі Бессарабавай сьледзтва выявіла, што яна памерла ад біцьця і агідных ран"... І гэты вось пратэст, як піша „Kur. Por.", надпісалі людзі, што некалі баранілі палякоў ад маскоўскага ўціску. „Першыя два подпісы—Пэклевэ і Гэррыо—гэта адзнака пэўне чыста палітычная, бо яны—*былыя ды і будучыя міністры, найбадзтнейшыя прадстаўнікі апазыцыі*".

Мы асабліва адзначаем апошняе: бо-ж як раз праз некалькі дзён пасьля абвешчаньня гэтага пратэсту ў Францыі адбыліся выбары новага парляманту, і на гэтых выбарах францускія працоўныя масы паказалі, як работніцкая Францыя глядзіць на ўнутраную і замежную палітыку сваей нацыяналістычнай буржуазіі і яе галоўнага абаронцы п. Пуанкарэ. На выбарах *перамагла „лявіца": сацыялістычныя і камуністычныя партыі*, як падлічыла віленскае „Słowo", *здабылі разам 297 дэпутацкіх месц, а нацыянальны блёк, кіраваны п. Пуанкарэ, толькі 229.* Значыць, левыя дапялі бліскучае пбеды: новы ўрад будзе складацца як раз з такіх палітычных дзеячоў, як тыя, што надпісалі пратэст проці „белага тэрору ў Польшчы", з Пэклевэ і Гэррыо на чале. І ўжо ясна, што старая палітыка Польшчы ў адносінах да беларусаў, украінцаў, літвіноў, немцаў і жыдоў *ня знойдзе ў Францыі ніякага падтрыманьня*.

Польскі ўрад, відаць, прадчуваў гэткія вынікі выбараў у Францыі. Яшчэ за месяц да іх паслы польскага сойму: „вызваленец" Тугут і п. п. с. Недзялкоўскі—лёталі па сталіцах Эўропы „ратаваць Айчызну" ў вачох эўрапэйскіх сацыялістаў, якім тлумачылі, што хоць у Польшчы дагэтуль было блага „меншасьцям", ды гэта хутка зьменіцца. А сьледам за гэтым і п. Грабскі пачаў склікаць нейкія таёмныя нарады ў справе „нацыянальных меншасьцяў", ды толькі... бяз учасьця самых гэных „меншасьцяў".

Мы дужа добра разумеем, што ўсё гэта мае на мэце не палепшаньне палажэньня „меншасьцяў", але ратаваньне гонару і павагі Польшчы ў вачох працоўных масаў Эўропы, якія ўсюды пачынаюць браць уладу ў свае рукі. І гэтая сьвядомасьць дае нам магчымасьць цьвяроза глядзець на справу і абмінуць абмылкі, якія шмат хто з беларусаў рабіў у сваім часе, даверыўшыся салодкім словам п. Пілсудскага. Польская буржуазія ня можа ў вадзін міг зьмяніць свае пагляды і імкненьні ў адносінах да „меншасьцяў", і ад яе нам нельга нічога спадзявацца....

Водгукі І-га мая.

У Вільні.

У ноч з 30-га красавіка на 1-га мая ў Вільні адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод работнікаў і беларускіх дзеячоў. Паміж іншым, вобыскі былі ў грам. Антона Луцкевіча, віцэ-старшыні Беларускага Нацыянальнага Камітэту; Язэпа Лагіновіча, сэкрэтара Бел. Нац. К-ту; вучыцеля Віл. Белар. Гімназіі Міколы Красінскага і інш. Арыштаваны старшыня бацькаўскага камітэту пры Віл. Бел. Гімназіі, ён-жа старшыня рэвізыйнае камісіі так-званага „Беларускага Грамадзянскага Сабраньня, Кепэль, а так-жа сябра гэнага Сабраньня, пісьменьнік Макар Кесьцевіч, якому зроблена была перад тым прапазіцыя быць рэдактарам польскае газэты ў беларускай мове, ды ён ад гэтага адмовіўся.

Раніцай 1-га мая на Замковай Гарэ быў вывешаны чырвоны сьцяг з надпісам у беларускай мове.

Праектаванае работнікамі адзінае сьвяткаваньне іх сьвята было разьбіта партыяй польскіх сацыялістаў (П.П.С.), якія дамагаліся, каб усе ішлі пад штандарам П.П.С. Большасьць работнікаў стаяла на тым, каб ісьці пад штандарамі толькі работніцкіх клясавых прафэсіянальных саюзаў—бяз ніякіх партыйных адзнак.

П.П.С. абвесьцілі, каб работнікі зьбіраліся на веча ў Мясцовую Залю. Але туды пайшла толькі частка работнікаў, пераважна чыгуншчыкаў, у значнай меры прыехаўшых сюды на службу з Польшчы. Большасьць работнікаў сабралася ў Работніцкім Доме, скуль вышлі на дэманстрацыю. Наперадзі паходу нясьлі штандар акружнае камісіі клясавых праф. са-

юзаў, якія стаяць на клясавым грунце, а з партыяў—польскі сацыялістычны саюз „Праца“, што аддзяліўся ад П.П.С., жыдоўскі „Бунд“ і камуністычная партыя Заходняе Беларусі. Зварачала ўвагу група беларускіх работнікаў, наперадзі якіх ішоў старшыня Бел. Нац. Камітэту пасол Б. Тарашкевіч.

У часе паходу канцавую групу на рагу вуліцы Міцкевіча і Татарскай паліцыя адрэзала і разагнала. Аднак, паход ішоў далей зусім спакойна. На Віленскай вуліцы на дэманстрантаў нападала банда студэнтаў і вучняў эндэкаў, якія кідалі каменьні і палкі. Каля дому № 12 нейкі правакатар выстраліў у паветра з рэвальвэру і сам уцёк, каб гэтак даць паліцыі магчымасьць разганяць паход. Ужо выясьнена, хто ён такі. Калі зьявілася паліцыя, студэнты і вучні, што кідалі каменьні, пачалі крычаць: „Хай жыве паліцыя!“ З вакон польскага ліцэю для дзяўчат у доме № 10 пры Віленскай вуліцы вучаніцы плявалі ў работнікаў.

З прычыны рэпрэсіяў адміністрацыі праектаваныя прамовы ў падворку Работніцкага Дому не адбыліся.

„Скорая помач“ дапамагла чатыром работнікам, раненым каменьнямі ў галаву.

Як паведамляе А. W., у гэты дзень паліцыя арыштавала каля 70 асоб.

У сувязі з выпадкамі 1 мая колькі дзён таму назад быў арыштаваны і пасьля дапросу звольнены сэкрэтар Бел. Цантр. Школьнае Рады Арс. Канчэўскі.

У начы з 11 на 12 мая паліцыя рабіла „праверку дакумэнтаў“ у кватэрах вучыцялёў Віл. Белар. Гімназіі і пачаткавых школ. „Праверка“ гэная адбывалася ад 12 да 4 гадзіны ўначы.

У доме № 7 пры Вострабрамскай вуліцы гэтак сама рэвізавалі ўначы ўсе кватэры.

Думаюць, што апошнія здарэньні знаходзяцца ў сувязі з назначаным на 12 мая зьездам беларускіх паслоў і сэнатараў у Вільні.

У Горадні.

Маёвае сьвята пачалося вельмі ўрачыста. У работніцкім паходзе нясьлі 21 чырвоных штандараў клясавых прафэсіянальных саюзаў. У часе паходу ўсьцяж адбываліся сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй.

Прамаўлялі: старшыня Рады праф. саюзаў Мазуркевіч, нейкі прадстаўнік прэсы, які вызваў абурэньне пахвальбой Пілсудскага, пасьля беларускі пасол Сымон Рак-Міхайлоўскі, які прывітаў сабраных ад імя сацыялістычных паслоў Белар. Пасольскага Клюбу і быў горача вітаны гарадзенскімі работнікамі. У часе прамовы чацьвертага прамоўцы, Грабоўскага, прадстаўніка саюза работнікаў па абработцы дрэва, паліцыя разагнала веча.

З Брыгідзкае вуліцы проці дэманстрантаў выскачыў атрад паліцыі з штыхамі на вінтоўках, як у атаку.

Не абыйшлося без арыштаў. Арыштаваны два работнікі саюза спажывецкага, адзін — работнікаў па дрэву (Міхал Сементкоўскі), адна работніца з фабрыкі Шэрэшэўскага, ды адзін невядомы.

У Беластоку.

Як і ў Вільні, польскія сацыялісты разьбілі работніцкую еднасьць. Замест аднаго супольнага для ўсіх сьвяткаваньня, адбываліся два вечы П. П. С. і клясавых прафэсіянальных саюзаў.

Беларускі пасол Валошын выступаў з прамовамі на абодвух вечах. На вечы клясавых праф. саюзаў яго віталі вельмі горача.

Палітычныя падзеі.

Перамены ў складзе ўраду.

Той сьмяротны ўдар, які нанясьлі французкай „правіцы“ толькі што адбыўшыяся выбары, даўшыя знамянітую перамогу сацыялістычнай лявіцы, не маглі прайсьці бяз рашучага ўплыву на Польшчу. На выбарах рашуча пабітай аказаліся якраз усе падтрымліваючыя Польшчу партыі, і да ўлады падойдуць амаль ня „ворагі“, калі ня Польшчы, дык ужо бязумоўна тэй польскай палітыкі, якая толькі што была якраз лідэрамі ўсіх цяпер перамогшых на выбарах групаў і кіраўнікоў заклеймяна, як палітыка „белага тэрору“...

І вось—зусім зразумела, што орыентаваўшыся на гэтую, толькі што кіраваўшую Краем „народную Францыю“, польскі ўрад пачуў сябе вельмі нялоўка і нямоцна. Трэба дапасоўвацца неяк да новых настрояў вялікага „пана“, ад якога незалежная Польшча знаходзіцца ў вельмі яўнай залежнасьці. І вось газэты падаюць, што найбольш важныя кіруючыя міністэрскія пасты, як мін. загран. спраў, унутран. спраў і прасьветы, якія заняты якраз найбольш яскрава афарбаванымі „нарадоўцамі“, атрымаюць новых кіраўнікоў.

На мейсца гр. Замойскага называюць наступнікам б. мін. загран. спраў у габінэце Сікорскага п. Скшыньскага, наместа толькі што назначанага мін. ўнутр. спраў б. пракурора Гюбнэра, якому было толькі што дадзена спэцыяльнае заданьне „падцягнуць“ Усходнія Крэсы, дух якога яскрава праявіўся ў расправах паліцыі з мірнымі першамайскімі паходамі па ўсей Рэспубліцы, і ў далейшым „фаршаваньнем“ польскіх вастрогаў „камуністамі“, намячаюць быццам „свайго“ Тугута...

Нарэшце, быццам гоняць у заслужаную адстаўку, можа найбольш яскравага прадстаўніка „белага тэрору“ ў галіне „прасьветнай“ палітыкі Польшчы мін. Міклашэўскага...

Ці будзе лепш ад гэтых пераменаў для нас беларусаў? Сьпярша пабачым, тады скажам...

У-ва ўсякім разе, калі будзе лягчэй, дык ня Польшчы прыдзецца нам за гэта дзякаваць, але „новай“ Францыі... І, трэба дадаць, — невялікую пашану да сябе ўзбуджае той, што робіцца лепшым ня з унутранага імкненьня і пашаны да дабра, але з аглядкі на нейкае вонкавае „начальства“, — са страху перад тым, каб ня „ўсыпалі“...

Арыштаваньне „банды“ ў Торуні.

У Торуні арыштавана 8 „обцокраёўцаў“, якія абвінавачываюцца ў тым, што злажылі шайку, якая ўчыніла некалькі зладзействаў, разбойных нападаў, забойстваў, і ў дадатку, шпегавала на карысьць Літвы і Радавай Расеі. Падазраваюць, што шайка мела сувязь з самім Мухай—Міхальскім...

Далейшыя ашчаднасьці.

У радзе міністраў адбываюцца нарады ў напрамку далейшага застасаваньня эканоміі ў дзяржаўных выдатках. Прынятыя рашэньні будуць зараз-жа праведзены ў жыцьцё на моцы „вынятковых паўнамоцтваў“ Прэзыдэнта Рэспублікі. Відаць ня вельмі верацьува ўрадзе павялічэньню дапльву даходаў да скарбу — з маёнткавага і інш. падаткаў, дык для падтрыманьня раўнавагі трэба ізноў зьмяншаць выдаткі...

Закон аб абароне кватэрантаў.

Распублікаваны афіцыяльна і з 1-га чэрвеня ўвойдзе ў сілу закон аб „абароне правоў кватэрантаў“. Да 1-га чэрвеня мае сілу стары дэкрэт.

„Школьная рэформа“ на Крэсах.

У ўрадзе, як падаюць газэты, ідуць нарады над нейкім „праэктам школьнай рэформы“ на Крэсах, які апрацараны мін. прасьветы Міклашэўскім. Што гэта за „рэформа“, можна толькі дагадывацца...

Абшарнікі ізноў дамагаюца „крэдытаў“.

Ад імя нашых крэсовых абшарнікаў да прэм. Грабскага езьдзіў п. Юндзіл, які скардзіўся на цяжары падаткаў, якія накладзены на вялікую зямельную ўласнасьць і дамагаўся новых крэдытаў ад скарбу. Пр. Грабскі ўважна аднёсься да заяваў прадстаўніка абшарнікаў, сказаўшы, што „разумее сітуацыю“.

За крытыку хьена-пястоўскага ўраду.

У Варшаве адбыліся два працэсы — рэдактароў „Голасу Праўды“—п. Стпічыньскага і „Роботніка“ — п. Борскага, якім закідалася зашмат вострая крытыка такога карыснага для краю ўраду прэм. Вітаса. Першы меў аж 2 канфіскаваных артыкулы, другі — 8. Абодвух за „непашанаваньне ўлады“ суд прысудзіў на 3 месяцы турмы.

Неадбыўшаеся спатканьне.

З прычыны выбарнага афронта прем. Пуанкарэ назначанае ўжо спатканьне абодвух прем'ераў Англіі і Францыі адкладаецца...

Забастоўка ахвіцэраў.

Дзіўная, нячуваная забастоўка пачалася ў Фінляндыі, дзе нездаволеныя парадкамі ў арміі ахвіцэры аб'явілі, што выходзяць у адстаўку. 90 працэнтаў ахвіцэраў салідарна бастуюць.—Дапраўды салідарнасьці могуць пазаздросьціць нават работнікі..

Барацьба з патрыярхамі ў Турцыі.

Галава турэцкага ўраду Кэмаль-паша заявіў заграничным журналістам, што, пасьля скасаваньня мусульманскага каліфату, дойдзе таксама чарод і да патрыярхатаў праваслаўнага і армяна-грэгорыянскага, а таксама і да жыдоўскага вялікага рабінату ў Турэччыне. Усе вынятковыя прывілеі, якімі дагэтуль карысталіся рэлігійныя арганізацыі, маюць быць скасаваны...

Нямецка-польскі канфлікт.

Нямецкі ўрад прыслаў польскаму ноту пратэсту, у якой паказывае на гвалты і шкоды, якія прычынены на Горным Шлёнску польскай палітыкай нямецкім грамадзянам. Нота просіць польскі ўрад прыняць меры, каб перасьцярагчы грознае палажэньне на Шлёнску; у праціўным разе складае ўсю атказнасьць за шкоды і крыўды на польскі ўрад.

Польскі ўрад на гэтую ноту атказаў, што ня бачыць патрэбы прынімаць якіясь надзвычайныя меры; што жыцьцё і маемасьць усіх асоб, жывучых у Польшчы, добра загварантаваны польскай Канстытуцыяй і што шлёнскія ўлады захоўваюцца „сьцісла папраўна і легальна“...

Як далей разьвернецца канфлікт, няведама.

Да канфлікту паміж Японіяй і Амэрыкай.

Прэзыдэнт Кулідж адсрочыў увядзеньне ў жыцьцё новага закону аб эмігрантах, што быў скіраваны пераважна проці наплыву японскіх работнікаў, якія сваей таннасьцю рабілі канкурэнцыю амэрыканцам.

Як ведама, з-за гэтага закону амаль ня ўспыхнула паважнага канфлікту паміж Японіяй і Амэрыкай.

Усенароднае галасаваньне аб адшкадаваньнях.

Нямецкія сацыял-дэмакраты прынялі пастанову дамагацца ад ураду перадачы пытаньня аб прыняцьці выпрацаванага рэчазнаўцамі Антанты пляну адшкадаваньняў—на ўсенароднае галасаваньне (гэтак званы „рэфэрэндум“).

Урад і правыя партыі баяцца гэткага „рызыкоўнага кроку“... Але сац.-дэм. стаяць моцна на праўным груньце, бо арт. 75 канстытуцыі дае права патрэбаваць рэфэрэндума, калі за гэта выкажыцца $^1/_{10}$ частка ўсіх выбаршчыкаў,—якую аж з лішкам маюць с.-д.

Кара сьмерці за „эканамічны шпіенаж“ у Маскве.

У Маскве прыоуджана кара сьмерці за „эканамічны шпіенаж“ старшыне і сэкрэтару дзяржаўнай прамысловай арганізацыі—за тое, што ў часе Лёнданскай дэлегацыі Красіна сябры гэтай установы рабілі інтарэсы на ўласную карысьць—коштам скарбу... Вось бы—да гэтай „санаторыі“ на колькі часу нашых „хіенцаў“...

Выбарная перамога опозыцыі ў Японіі.

Дакладных вынікаў выбарнай кампаніі ў Японіі яшчэ няма, але ўжо можна сказаць аб рашучым правале правага ўрадовага блёку і ў Японіі.

Дагэтуль ведама, што опозыцыя атрымала 153 мандаты, урадовыя партыі — 52, незалежныя (вельмі блізкія да опозыцыі)—96...

Ня дзіва, што прэм. Кіоура, нават ня чакаючы далейшых вынікаў, уручыў мікаду сваю адстаўку...

Гэты правал—таксама заслужаная кара за той „белы тэрор“, які заядла праводзіў урад асабліва пасьля „разрухаў“, выкліканых зямлітрасеньнем ў Японіі.

К нямецка-расейскаму канфлікту.

Нямецка-расейскі канфлікт, які выкліканы быў колькі дзён назад рэвізыяй і арыштамі ў гмаху радавай targовай місіі, у Бэрліне, (якая павінна, нараўне з пасольствам карыстацца нятыкальнасьцю), як ведама маль не давёў абедзьве Рэспублікі да разрыву ды-

---

Вінцук Адважны.

Мікіта.

(Байка).

Жылі-былі мядзьведзь з мядзьвядзіхай. Жылі яны ў вялікай пушчы. Радзіўся ў іх сынок Мікітка. Мядзьвядзянё было шустрае, здаровае, вясёлае. Рос Мікітка, рос, што дня быў большы і здаравейшы. І вот вырас на вялікага мядзьвядзя — Мікіту. Бацькі не маглі нацешыцца з яго: такі ўжо быў удалы і прыгожы ну—проста кроў з малаком. Але не пад сілу зрабілася бацьком выкарміць яго; дык стары мядзьведзь і кажа: „Слухай, сынок! ты ўжо вялікі Мікітка, а мы старыя. У цябе сіла вялікая, а равеш мацней за мяне: можаш сам на сябе зарабіць. Ідзі на свой хлеб“.

Што зробіш? Выбраўся Мікіта ад старых бацькоў. Бацька яму адмерыў кавалак лесу, кусок пасекі, полацць пацяробу ды хмызнякоў паласу. Усяго з усім разам дык за месяцы тры ўкруг не абышоў-бы. Ідзе сабе Мікіта па сваей Бацькаўшчыне, разглядаецца, аж гоп! у воўчую яму і ўваліўся.

Тут ваўкі яго абскочылі, завылі, забрахалі: прасілі быць госьцям. Гасьцілі доўга, кармілі смачна, клалі спаць у мягкую пасьцель. Неяк яно так злажылася, што мядзьведзь тамака саўсім зжыўся і астаўся: было яму добра і спакойна. Толькі-ж дзень па дні пераходзіць, а Мікіце работы даюць больш, а ежы меньш. Мікіта ваўчанят забаўляе, Мікіта старажыць ў ночы, Мікіта сьцеле пасьцель, папраўляе яму, ходзіць на паляваньне. Ды ўсё ён не дагодзіць; як не стараецца, а ўсё ня добра. Бывала плача бедны ў ночы, або стогне. Дык і тут на яго ваўчыха азьверылася: „ты, кажа, нам спаць у ночы не даеш“. Кляў мядзьведзь сваю долю. Але вось што было горш горшага, дык тое, што ваўкі забаранілі Мікіце раўці памядзьвежаму: казалі выць павоўчаму. Як ён не стараўся, а ніяк ня мог патрапіць: голас меў лішне грубы, дык воўчую ноту ня мог выцягнуць. Бывала, аж спацее, аж у горле баліць: так стараўся, каб было тонка, дык і то ваўкі злуюць і сьмяюцца. Адзін раз у ваўкоў было вясельле. Казалі Мікіце пяяць, танцаваць, а самі з яго сьмяюцца, дражняць. На заўтра мядзьведзь злавіў бычка, прынёс да ямы і аддаў ваўком. Ваўчыха наракае, што худога злавіў. Ну, ваўкі ядуць, балююць, гуляюць, а Мікіце далі пасмактаць толькі голую скуру. Жаль нейкі сьціснуў за горла Мікіту і ён ужо хацеў сабе сьмерць зрабіць.

Калі гэта раз Мікіта дрэміць каля ямы, а старая ваўчыха навучае ваўчанё, як жыць на сьвеце. Яна Мікіты ня прыгледзіла. Толькі гэта Мікіта чуе, як ваўчыха гаворыць свайму дзіцяці: „...ты нікога ня бойся! будзь сьмелы і хітры, дык тады цябе будуць баяцца ўсе. Вось мы маем на службе мядзьвядзя. Ён сільны; мог-бы нас усіх пабіць, але мы яго перахітрылі, бо ён дурны Мікіта“.

У Мікіты стала біцца сэрца; кроў ударыла ў галаву. „То так? думае Мікіта: яны павінны мне служыць, а не я ім. Ну, досыць я пакутаваў праз свой дурны розум!“

Схапіўся Мікіта, ды калі стукне кулаком ваўчаняці па галаве, дык яно і лапкі задзёрла. Ваўчыха да Мікіты, а ён як плясьне ёй лапай па мордзе, дык зубы й пасыпаліся. Ваўчыха завыла нямым голасам; адкуль узялася цэлая стада ваўкоў, ды да мядзьвядзя. А ён калі гэта вырве ёлку з каранём, ды як махне раз—палавіну палажыў; як махне другі раз, дык ані аднаго не асталося. Аж тут надбягаюць воўчыя сваякі: шакалы, ваўкалакі, гіены. Мікіта і тым галовы паскручаваў.

Тагды Мікіта зароў чыстым мядзьвежым голасам, ды так звучна, што рэха панясло той голас далей і далей, аж на край лесу. Задрыжэлі горы, затрасьліся дубы старыя, запужаліся ўсе зьвярата ў лесе. Тады ўсе пазналі, што Мікіта стаў вольным гаспадаром у сваей Бацькаўшчыне. („Кгуніса“ № 6).

пломатычных зносінаў... Радавы ўрад рашуча і адразу спыніў усякія чыннасьці ўсіх установаў радавых у Нямеччыне і нямецкіх у СОРР, пакуль не атрымае здаволеньня нанесенай Саюзным Рэспублікам абразы...

Доўга цягнуў зьлеквідаваньне ўсей гэтай справы нямецкі, ўзмоцняны памыснымі выбарамі, правы ўрад... Але нарэшце—байкот з боку Радаў, відаць, адчуваецца моцна: толькі што нямецкае мін. загран. спраў заявіла, што згаджаецца выразіць сажаленьне і перапрасіць Радавы ўрад за пагвалчэньне прывілеяў яго дэлегацыі.

Трэба думаць, што хутка ўвесь канфлікт будзе зьлеквідаваны аканчальна.

З газэт.

„Палітыка і эканомія“.

Пад гэткім загалоўкам выдатны польскі эканаміст, Ст. А. Кемпнэр, друкуе цікавую статцьцю ў „Kur. Por.“, у якой выясьняе, што справа устанаўленьня курсу новае польскае валюты на сусьветным рынку ў надта вялікай меры залежыць ад... польскіх адносінаў да „нацыянальных меншасьцяў“.

Апрача нячысьленых выняткаў францускіх газэт, заграгічная эканамічная прэса, якая заклікае апінію сьвету да міра, гуманітарызму, спыненьня сварак, — даводзе, што быццам аднэй з перашкодаў у гэтым зьяўляецца дражнючая ў нацыянальных справах палітыка Польшчы.

Так кажа Кемпнэр. І далей прыводзе цікавыя заявы замежных газэт:

Вось, паміж іншым, чытаем, што Польшча дала доказ, што мае ў роўнай меры, як матэрыяльную, так і інтэлектуальную сілу, каб адыграць выдатную ролю ў сям'і культурных народаў, але ня выявіла яшчэ даволі маральных сілаў. Палітыка шовінізму, палітыка, якая узьдзела аброць на разьвіцьцё народаў, што злучаны з польскай дзяржавай, ня толькі шкодна для ўнутранае спайкі дзяржавы, але і вонках вытварае пабуджэньне для міжнародных антаганізмаў. А гэта не пазваляе яшчэ мець поўнае даверье да аздараўленьне скарбу, якое таксама павінна грунтавацца на падставах унутранага міру.

Вось, чаму п. Грабскі пачаў рабіць від, што займаецца разьвязаньнем пытаньня аб „меншасьцях“. На наш пагляд, пытаньне гэтае даўно разьвязана... на паперы: у вэрсальскім трактаце аб правах „меншасьцяў“ і ў польскай канстытуцыі. І ўсе сучасныя нарады прадстаўнікоў улады з польскімі партыйнымі дзеячамі толькі лішні раз падцьвярджаюць, што ні трактату, ні канстытуцыі п. Грабскі дзяржацца ня зьбіраецца. Сусьветнае-ж біржы гэтымі нарадамі супакоіць хіба ня ўдасцца...

Рэзультаты выбараў у францускі Парлямэнт.

Ня гледзючы на страшэнна гарачую агітацыю, на аграмадныя сумы, кінутыя на выбарную работу лідэрамі „нацыянальнага блёку“, (у распараджэньні аднаго толькі лідэра франц. прамысловцаў сэнатара Вільбе быў цэлы капітал *у 60 мільёнаў франкаў!..*), ня гледзючы на ўсе перавагі ўрадовай, пакуль што кіруючай, меўшай у сваім распараджэньні вялізарны апарат урадоўцаў, партыі,—ня гледзючы на ўсё гэта на францускіх выбарах *урадовыя партыі правалiлiся, а перамагла апазыцыя*...

Як ня страшылі „народовыя“ плякаты выбаршчыкаў—не галасаваць за „германафілаў“, якія сваей павольнасьцю адносна да немцаў быццам хочуць выклікаць новую вайну, народ зразумеў, з якога боку якраз ідзе пагроза новай вайны і аддаў свае галасы апозыцыі...

Паводле дагэтуль атрыманых даных „нацыянальны блёк“ здабыў 229 пасольскіх месцаў, „блёк лявіцы“—297...

Няма яшчэ рэзультатаў галасаваньня ў калёніях і ў адным з паўночных дэпартамэнтаў. Але можна быць пэўным, што вялікай перамены ў лічбах ужо ня будзе.

У выніку гэткага паражэньня кабінэт п. Пуанкарэ 13 траўня пастанавіў падаць у адстаўку, пачакаўшы толькі да 1 чэрвеня, калі мае сабрацца новая палата.

Хто-ж будзе наступнікам Пуанкарэ?

Франц. прэса называе 2 кандыдатаў: Першы з іх—Бріан—папярэднік Пуанкарэ. Гэтага Бріана самы Пуанкарэ разам з прэзыд. Рэспублікі Мільеранам у канцы 1921 г. (ў часе Каннскай Канфэрэнцыі) зваліў тады за тое, што ён быццам быў залішне ўступчывым ангельск. прэм. Ллойд-Джорджу і зашмат лагодны да немцаў...

І вось той самы Бріан можа цяпер вярнуцца да ўлады—пасьля 3 гадоў панаваньня Пуанкарэ, які давёў францускую палітыку да поўнай кампраміітацыі...

Але справа—ў тым, што цяпер ужо нават для Бріана абставіны непамысны, бо і ён павінен ці ангельскі партнёр — даўно ўжо ў адстаўцы, уступіўшы месца сацыялісту Мак-Дональду... Чуючы гэта, сам Бріан ужо ў часе выбарнай кампаніі заявіў, што *ня будзе шукаць прэм'ерства*...

І вось высоўваецца другая, шмат больш яскравая асабістасьць, знаная з сваіх *больш радыкальных* сымпатыяў, адзін з першых палітычных дзеячоў Францыі, які зусім выразна паставіў мэту і зразумеў патрэбу паразуменьня з сучаснай Расеяй і першы „рызыкнуў“ паехаць туда асабіста... Гэта лільскі дэпутат п. Гэрыо (Herriot).

Зразумела, што якраз такая палітычная фігура найлягчэй і найпрасьцей згаворыцца з ангельскім прэм'ерам, які, як бачым, пры ўсей сваей скромнасьці і лагоднасьці, пачаў іграць рашучую ролю ў эўрапэйскай палітыцы, у значнай меры зьбіўшы самаго Пуанкарэ...

Ня трэба забываць і таго, што франц. камуністы атрымалі 32 месцы, *пры большасьці наогул левага блёку* дае гэтай групе вельмі важную, *часам рашучую ролю ў палаце*...

Вось яшчэ адна прычына таго, што Бріан уступіў месца яркаму „радафілу“ Гэррыо...

Чаго-ж можна чакаць ад гэтага новага ўкладу сіл у Эўропе, калі абедзьве найвялікшыя дзяржавы будуць *ня ў „вайнэ“*, як за гэтыя 3 гады, *але ў паразуменьні*, а да таго яшчэ — *ў паразуменьні на шчыра мірнай і*... можа ня зусім шчыра, але ўсё-ж такі неяк *сацыялістычна ахварбаванай праграме*,—аб гэтым пагаворым у наступны раз.

Але адно ўжо зусім ясна: таго галоўнага жалеза-бэтоннага слупа, на якім базавалася эўрапэйская рэакцыя, у асобе п. Пуанкарэ, больш ня будзе...

І, як бы мала мы ні верылі ў пануючы над намі гаспадарственны „розум“, але гэты факт — поўнага краху наймацнейшай вонкавай апоры гэтага нашага ўнутранага „неразумія“, *павінен адбіцца*, можа нават вельмі рашуча, і на нашым, у часцы—і на беларускім жыцьці...

Дык маймо моцную веру ў тое, што і час і ход гісторыі і розум падзей—за нас, і—процi нашых „паноў“.

Беларускія зьезды---вечы.

4-га траўня адбыўся ў **Лідзе** зьезд —веча, на якім прамаўлялі нашы Соймавыя дэпутаты Бр. Тарашкевіч, Сым. Рак-Міхайлоўскі і Ант. Аўсянік. На веча зьехаліся сяляне большасьці гмінаў Лідзкага павету.

Таго-ж 4-га траўня адбыўся ў **Баранавічах** такі самы зьезд—веча, на які зьявіліся прадстаўнікі сялянства Баранавіцкага павету. З прамовамі на вечы выступалі беларускія дэпутаты: Міх. Какановіч, Вас. Рагуля, Ф. Яроміч і сэнатар Назарэўскі.

Прадстаўнікі Беларускага Пасольскага Клюбу інфармавалі на гэтых вечах зьехаўшыхся выбаршчыкаў сваіх аб працы сваей у Сойме, аб тых законах, якія прыняты Соймам, аб немагчымасьці пры ўсіх іх высілках палепшыць долю сялян (зямля, школы, правы і інш.), разважалі справу аўтаноміі для Заходняе Беларусі і г. д.

Гэткія зьезды—вечы, калі яны добра нарыхтаваны, карысны з таго боку, што адначасна інфармуецца ўвесь павет, што мацней і ярчэй выяўляецца беларуская думка, узварушваюцца належным спосабам сацыяльныя пытаньні, асьвятляецца сучаснае становішча Польшчы і палітыка ўраду яе да беларускае люднасьці.

4-га траўня адбыўся мітынг **ў Жыровіцах Слонімскага павету**. На гэтым мітынгу выступаў з прамовай сябра Белар. Пас. Клюбу, сэнатар Вяч. Багдановіч. Зацікаўлены справаю лёсу Жыровіцкае царквы, сэнатар зрабіў інтэрвэнцыю ў Слонімскага Старосты, а ў дзень 4/V, як найбольшы знаўца цяжкага становішча праваслаўнае царквы ў Польшчы, зрабіў нараду ў самой Жыровіцкай царкве, дзе абгаварываліся чыста царкоўныя і рэлігійныя справы. Пад вечар таго-ж дня на пляцу ў Жыровіцах сэнатар рабіў сабраўшымся выбаршчыкам (чалав. 300) справаздачу аб працы беларускіх прадстаўнікоў у Сойме і Сэнаце. Пасьля мітынгу сабраў шмат скаргаў і мае асабліва старанна абараніць для крыўджанае праваслаўнае люднасьці Жыровіцкую царкву.

6-га гэтага траўня адбыўся беларускі мітынг **ў Юраўлянах Сакольскага павету**, на якім з прамовай выступіў наш дэпутат Пав. Валожын. Быў сьвяточны дзень для праваслаўнае людносьці — Юр'я. Народу было ў часе гэтага фэсту да 2.000 асоб. Люднасьць вітала свайго дэпутата, дзякавала за адведзіны і склала яму шмат скаргаў.

6-ж траўня ў дзень праваслаўнага сьвята Юр'я і адначасна Радаўніцы адбыўся **ў Жыровіцах Слонімскага пав.** шматлюдны беларускі мітынг, дзе выступіў з вялікай праграмовай прамовай наш дэпутат Міх. Какановіч, выступленьне якога зрабіла вялікае ўражаньне на прысутных.

8-га траўня **ў Даўгінаве Вялейскага пав.** ў часе каталіцкага сьвята, дзе з прычыны фэсту зьехалася шмат народу, адбыўся беларускі мітынг, на якім прамаўлялі прадст. Белар. Клюбу кс. Ад. Станкевіч і Ант. Аўсянік. Перад некалькітысячнай грамадой беларускага сялянства першым прамаўляў Аўсянік, а як выступіў пасьля яго кс. Станкевіч з прамовай па пытаньнях аб зямлі, аб роднай школе, аб самаўрадах, дык пешая і конная паліцыя з штыкамі і голымі шаблямі пачала разганяць народ. Абураны народ усё-ж прастаяў на мейсцы да канца прамовы дэп. Станкевіча.

Па інтэрвэнцыі дэпутатаў у камэнданта паліцыі былі звольнены некалькі чалавек, заарыштаваных бязпраўна за прысутнасьць на мітынгу.

Справай такога надужыцьця з боку паліцыі і распараджэньняў у гэтым выпадку дла яе ад Вялейскага Старосты на пасольскай справаздачы мае заняцца Бел. Пас. Клюб ў Варшаве.

22-га гэтага траўня мае адбыцца **ў Навагарадку** мітынг-зьезд прадстаўнікоў гмінаў і вёсак Навагарадзкага павету. З прамовамі маюць выступіць там дэпутаты В. Рагуля, М. Какановіч і др.

Весткі з вёскі.

З Даўгінаўскае гміны.

(*Ад нашага карэспандэнта*).

Тутэйшыя сяляне перажываюць цяжкія часы на прадвесьні. Вясна прыпозьнілася, і корму для скаціны не хапіла, дык шмат дзе рэзалі салому з стрэх на корм. Прыкупіць жа корму няма за што, бо грошы, якія ўдалося выручыць за свой хлеб, пайшлі ўсе на падаткі.

4 мая на ст. Будслаў прызыўныя крэпка пабілі некалькі жыдоў. Паліцыя не мяшалася.

Паміж Стахавам і Каралінай, ужо за гранічнай мяжой, нет-ведама кім забіта дзяўчына Бабарэка, з Туркі.

Сьвяткаваньне польскага сьвята 3 мая прайшло ў Даўгінаве даволі слаба. Прамаўляў адзін толькі прамоўца, уланскі афіцэр, які славіў тую волю, якой карыстаецца наш народ пад уладай Польшчы. Слухаючы гэта сяляне казалі між сабой, што аб гэтым шмат можна было-бы пагаварыць, ды ўсяго сказаць нельга...

Араць у полі ў той дзень не давалі, хоць цяпер кожны дзень дарагі. Паліцыя аб'яжджала ваколіцы Даўгінова і зганяла ўсіх з поля. **Паддаўгінаўскі.**

Напад пад Алькенікамі.

Надовячы група невядомых узброеных людзей напала на купцоў, якія ехалі з мястэчка на ст. Алькенікі. Як паведамляюць польскія газэты, гэная група людзей складалася з літвіноў і мела характар паўстанчы і разам рабункова. Адзін з іх папаўся ў рукі паліцыі. Гэта А. Сабалеўскі, паходзячы з вёскі Пушкарня, якая знаходзіцца ў 4 вярстох ад Алькенік і 6 вёрстох ад літоўскай граніцы.

Напады ў Нясьвіскім пав.

„Słowo“ паводле тэлеграфных вестак пераліччае напады, якія адбыліся ў Нясьвіскім павеце за апошні час.

30 красавіка атручана 5 каней у двары Наруцэвіча; 4 мая забіты вучыцель у в. Амошкі, ранены солтыс, „вывядовца“; 8 мая зрабаваны ўсе коні ў двары Касмовічы, уласнасьць Мысьліцкага, забіты „карбовы“, ранены аканом. Банды перайшлі граніцу. 8 мая падпалены стайні ў двары Мірскага.

Падпал казённых дроў.

„Dzien. Wil.“ піша:

„У начы з 3 на 4 мая г. г. паміж станцыямі Бельск і Гайнаўка машыніст праяжджаўшага пасажырскага поезду заўважыў, што зложаныя пры чыгунцы дровы гараць. Высланая ўраз-жа чыгуначная пажарная дружына затушыла пажар. Згарэла каля 30 кубічных мэтраў дроў. Пачатковае сьледзтва выявіла, што пажар узьняўся ад падпалу, зробленага бандамі, што бадзяюцца ў гэтых ваколіцах“.

Разрыў поезду.

Надовячы, як паказуе „Dzien. Wil.“, паміж Друскенікамі і Марцінканцамі разарваўся скоры поезд № 702.

Доля быўшых панскіх батракоў-чэляднікаў.

Вёска Вётхава Беніцкае воласьці Ашмянскага павету (1 вярста ад ст. Залесьсе) дастала пасьля скасаваньня паншчыны на 16 паасобных сямействаў былых батракоў *толькі* 48 дзесяцін зямлі, г. зн. па 3 дзесяціны на сямью. І з таго часу аж да гэтага году не прырэзана вёсцы ані воднай пядзі зямлі, а купіць ня маюць за што. У вёсцы налічаецца цяпер 22 паасобныя двары. Марнеюць людзі, чакаюць лепшых дзён, і з году ў год прадаюць за бясцэн сваю працу на дворнай зямлі акаліцных паноў. А панская зямля аб-

кружыла вузенькія палеткі вётхаўцаў з усіх бакоў. Вётхава—маленькі мужыцкі востраў у моры панскай зямлі двара Залесьсе кн. Агінскіх, а цяпер п. Высоцкага. Гэтаму пану закарцела раптам развязаць справу сэрвітутную з былымі „падданымі“ двару вёскамі Міхнєвічы, Зарудзічы і Алянец. І мае намер выдзяляць прыналежную вёскам зямлю з сэрвітуту там, дзе ён хоча. Сяляне памянёных вёсах на падзел сэрвітуту не згаджаюцца—і добра робяць, бо іначай загубяць вётхаўцаў. Справа ў тым, што Вётхава не залічана было да лічбы тых вёсах, якія маюць права карыстацца ўсім сэрвітутным абшарам для пасьцьбы сваей жывёлы. І калі вётхаўцы і карысталіся сэрвітутам, дык толькі дзякуючы салідарнасьці і падтрыманьню сваіх суседніх вёсак. Калі-ж цяпер непамысна для вётхаўцаў разьвяжацца сэрвітутная справа, дык „крышка“ беднай вёсцы: трымай жывёлу цэлы год ў хлеве, альбо прадавай і гінь сам, альбо адрабляй двару Залесьсе за дазвол пасьцьбы гэтулькі дзён, колькі пану захочацца.

Калі-ж, урэшці, прыдзе лепшая доля для беднай вёскі Вётхава? N.

Ох, гэтыя падаткі!

Няма збаўленьня, няма ратунку ад гэтых падаткаў. Мы ўжо ў вёсках стогнем ад гэтых падаткаў і думаем — ці не вымысьляець іх хто-небудзь той, хто хоча зусім пусьціць з торбай чалавека нашага па сьвеце. Прост—хоць выракайся сваей зямлі, хаты... Дапраўды і пальцаў не хапае пералічыць усе віды падаткаў: і на гміну, і на соймік павятовы, і зямельны падатак, і ад маемасьці наогул, і дзяржаўны, і дзяржаўнае тут яшчэ прымусовае страхаваньне! А тут яшчэ—кажуць людзі—што незабавам прыдзецца плаціць падатак нейкі ваявудзкі. Асабліва-ж дапякае цяпер гэтая страхоўка. Такую складку за год цяпер павызначалі, якой да вайны вялікай ніхто й ня сьніў. Бо жарты-ж?! Пудоў дваццаць жыта трэ' было-б нашаму вяскоўцу прадаць, каб заплаціць страхоўкі ў год 70—75 мільёнаў. А дзе-ж узяць гэтулькі жыта ды яшчэ вясной, сёлятней вясной, такой позьняй?! А тут ганяюць, каб заплаціў чалавек страхоўку абавязкова да 1 чэрвеня, усю адразу. Калі меў чалавек які лішні пуд жыта (ды і хто меў лішні!), дык даўно прадаў на ранейшыя падаткі, а то каб купіць трохі саломы, каб выжывіць карову ці коніка да травы, а тут раптам—плаці страхоўку. І ліха яго ведае — што тут рабіць. Хоць кароўку бяры на вяроўку і цягні на рынак. Хоць і паном, здаецца, дастаецца, нібы енчаць і яны ды ўсё адцягаваюць сплату падаткаў, але-ж, ўрэшці-рэшт, ліха іх ня бярэць—прадаў лесу і ёсьць на падаткі, а дзе-ж узяць грошай нашаму брату, вяскоўцу-сярмяжніку, калі заработкаў нідзе няма, а калі і ўзаб'ешся дзе-небудзь на работу ў лесе на які тыдзень, дык-жа на дзённыя харчы там, дапраўды, не заробіш?

Вось гора настала гэтай вясной! Дальбог-жа—ня ведаю, ці пераможам яго?!

Вясковец.

Рэдакцыя наша атрымлівае масу гэтых скаргаў на цяжар падаткаў для нашае вёскі, не аджыўшай яшчэ з прычынаў вайны і агульнага зубожаньня. Друкуючы—дзеля браку мейсца ў газэце—пакуль што толькі гэтую адну карэспадэнцыю ў справе падаткаў, паведамляем нашых чытачоў, што ў дзеле ўплаты сёлета страхоўкі ня ёсьць 1 чэрвеня апошняя дата. На падставе інфармацый, атрыманых намі з *Dyrekcji Ubiezpieczeń Wzajemnych* у Вільні, паведамляем, што незаможныя вяскоўцы могуць выплаціць страхоўку і пазьней 1 чэрвеня, і што прадажы маёмасьці гаспадара за няўплату да 1 чэрвеня страхоўкі ня будзе. Апрача таго *зусім пэўна*, што вызначаная на гэты год страхоўка будзе разложана прынаймней на 2 раты.

А што тычыцца наогул нязьмернага цяжару падаткаў для вёскі, дык тут мы нічога не паможам; адно можна сказаць: самі сабе дарадзьце!

Беларускія спэктаклі.

Нясьвіжскі павет.

На другі дзень праваслаўнага Вялікадня адбыліся беларускія спэктаклі: 1) ў вёсцы Іванава Ланьскай гміны — ставілі п'есу „Модны Шляхцюк“; 2) ў вёсцы Лысіцы Гародзейскай гміны — ставілі п'есу „Зьбянтэжаны Саўка“; 3) ў вёсцы Клапацічы—Сіняўскай гміны—ставілі п'есу „Пінская Шляхта“.

Шмат іншых вёсак меліся ставіць беларускія спэктаклі, але па фармальных прычынах Староства Нясьвіжскае ня выдала дазволу.

Аднэй з цяжкіх фармальнасьцяў, якіх што раз вымагае Староства—гэта прадставіць пераклад п'есы у польскай мове. Рэдка ў якой вёсцы знойдзецца перакладчык, дзеля чаго часта зрываюцца спэктаклі.

Таемнае забойства.

У вечары 5 гэтага траўня у вёсцы Аношкі Нясьвіжскага павету Сноўскай гміны невядомымі застрэляны вучыцель Кавальскі, прысланы з Галіцыі, і солтыс, а сышчык Мельнік ранены. На месца выяжджаў пракурор і сьледавацель. Ідзе сьледзтва. Кажуць, што гэтага вучыцеля Інспэктар часта пераводзіў з аднэй школы у другую, бо вельмі не падабаўся сялянам.

Вясковы.

Як вядзе сябе Нясьвіжская шляхта.

Нясьвіжская шляхта страшэнна абурана на нашых беларускіх паслоў, якія 16 сакавіка у Нясьвіжы на беларускім зьездзе рабілі справаздачу. Гэта справаздача не спадабалася, разумеецца, паном-абшарнікам, адміністрацыі, паліцыі і іншым, хто так ці іначай апякуецца тутэйшымі земляробамі-беларусамі. Засьцянковая шляхта таксама лічыць сябе палякамі і паўтарае усякую „брахню“ на нашых паслоў, абзываючы нашых выбраньнікаў самымі няпрыстойнымі словамі. І лаюцца яны ўсюды. Калі-ж хто з беларусаў часамі адважыцца бараніць сваіх прадстаўнікоў, дык шляхта усякімі срэдствамі стараецца напакасьціць яму. Яны падаюць даносы ў паліцыю, што такі-то і такі ёсьць бандыта, бальшавік, лае польскую уладу і агітуе проціў Польшчы.

І зусім вядома, што фальшыва абвіначанага арыштоўваюць і водзяць па сьледчай паліцыі, каб той сазнаўся да якой „банды“ належыць.

Гэтак было з адным сьвядомым беларусам Новікам Янкам з хутара Залуж'е Ланьскай гміны, які адважыўся бараніць гонар беларускіх прадстаўнікоў у Сойме. Суседняя шляхта зрабіла данос, і Новіка арыштавалі, але праз тыдзень звольнілі з-пад арышту, бо сьледавацель віны у ім не знайшоў. А даносчыкі з шляхты застаюцца, вядома, непакаранымі.

Выбаршчык.

Не ўдаліся хітрыкі.

У вёску Круты-Бераг Гародзейскай гміны Нясьвіжскага павету зьявіліся тры асобы: два мужчыны і адна жанчына і аб'явілі сябе хіромантамі (гадальшчыкамі), занялі кватэру і сказалі, што будуць тут цэлае лета. Нават паказалі дакуманты. І што-ж аказалася!? Дакуманты выданы Нясьвіжскім Старастай. Хлопцы адразу раскумякалі, што гэта ма быць фальшывыя гадальшчыкі. Гадалі яны толькі ўвечары і прымалі толькі па аднэй асобе, плату бралі па 3 мільёны.

Вось адна дзяўчына, А. М., пераадзелася паджылой ужо жанчынай і пайшла даведацца, ці гэта праўдзівыя варажбіты. Варажылі яны зусім няўдала, няўмела. У часе гаданьня дзяўчына прыпамінае, дзе яна бачыла гэтага чалавека. Аж потым успомніла, што гэта сышчык, які ўзімку рабіў у яе вобыск. Пасьля яе ўжо ніхто больш не пайшоў да варажбітоў, і госьці гэтыя а 12 гадзіне ўночы зьніклі, нічога не зарабіўшы. Перад дзяўчынай варажылі яны яшчэ толькі двум хлапцом, якіх наводзілі на размову „czy służył w wojsku rosyjskim, czy kocha Białoruś, czy walczył-by za Polskę“ і г. д.

Вось якімі авечкамі прыкідаюцца гэтыя ваўчкі і можа дзе ўдаецца аграбіць даверчавых сялян, якія і так шмат плацяць падаткаў і на ўтрыманьне ўсялякіх вывядоўцаў.

Ю.

Ізноў Муха.

Уначы з 7-га на 8-га гэтага траўня, Муха, як кажуць пагаласкі, зрабіў напад на двор Касмовічы Ланьскай гміны, забіў гаспадара маёнтку, узяў дзевяцёра коняў і схаваўся.

ХРОНІКА.

„Голас Беларуса“ зачынены. З 21 нумароў „Г. Б.“ былі сканфіскаваны №№ 14, 15, 19 і 21. За артыкул „Незалежнасьць і залежнасьць“ у № 14 газэта зачынена судовымі ўладамі.

Беларускія дэпутаты ў Дэлегата Романа. Дэпутаты Тарашкевіч і Ярэміч 13. V. зрабілі інтэрвенцыю ў Дэлегата Польскага Ураду на Віленшчыну (ваяводы) Романа ў мэтах прысьпяшэньня разгляду справы заарыштаваных уначы на 1 мая М. Кэпеля, М. Косьцевіча, А. Салагуба і др. і выпушчэньня іх на волю. Дэлегат дакляраваў зрабіць захады да ўскарэньня разгляду справы заарыштаваных.

11-га траўня ў Беларускай Драматычнай Майстроўні адбылася чародная лекцыя гр. А. Луцкевіча „Аб драматычнай творчасьці Я. Купалы“. Пасьля лекцыі быў канцэртны аддзел.

У нядзелю, 25 травеня 1924 г. у залі Майстроўні (Вострабрамская № 9) ладзіцца Вечар расейскае музыкі. У праграме: Глінка, Даргамыжскі, Рахманінаў, Чайкоўскі, Арэнскі, Кюі, Рубінштэйн, Балакіроў.

У канцэрце прымаюць удзел Віктар і Тамара Бэйэры, Вінчас-Войчыс і хор Драмат. Майстроўні.

Збор пойдзе на карысьць незаможных вучняў Віленскае Белар. Гімназіі.

Пачатак а 8 гадз. ўвечары.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада складае шчырую падзяку ахвярадаўцам украінцам, прыслаўшым праз газэту „Украінскі Голас“ 50 мільёнаў п. м. і Беларускім студэнтам у Празе за прысланыя 25 даляраў і 580 чэскіх каронаў на развіцьцё беларускіх школаў.

Паседжаньне Беларускага Пасольскага Клюбу ў Вільні адбылося 12 траўня. Прынята шмат важных пастановаў. Паседжаньне з малым перарывам цягнулася ад 12 гадз. дня да позней начы.

У Віленскім Апэляцыйным Судзе мае разглядацца 22. V. 24 г. справа Дварэцкіх, Шлойдаў, Шацёра і інш. беларускіх юнакоў з аколічных вёсак каля ст. Аляхновічы. Віл. Акр. Судом гэтыя хлапцы засуджаны былі свайго часу на кару 6—8 гадоў кожны „за ўчасьце ў загаворы, які меў на мэце адарваньне беларускіх зямель ад Польшчы і рабунковыя напады“, як сказана ў прыгаворы Акружнага Суда.

Абаронцам выступае віл. адв. Т. Урублеўскі.

У тым-жа судзе 27. V. 24 г. будзе разглядацца справа Міколы Якімовіча з Горадні, які Горадз. Акр. Судом быў засуджаны на $2^1/_2$ гады крэпасьці. Абаронцамі маюць выступіць віленскія адвакаты Т. Урублеўскі і С. Міцкевіч.

Арышт вучня Віл. Бел. Гімназіі. Уначы з 30. IV на 1. V. г. г. Ашмянскай паліцыяй заарыштаваны ў вёсцы Зарудзічы Беніцк. гміны Ашм. павету вучань IV кл. Віл. Бел. Гімн. Ал. Салагуб. Прычыны арышту невядомы. Заарыштаванага Салагуба трымаюць дагэтуль у Віленскай турме на Лукішках.

„Перахварбоўка“. Карэспанд. „Dz. Wil.“ меў гутарку з дэлегатам ураду, п. Раманам, які сказаў, што ў хуткім часе Віленскі Адміністрацыйны Округ мае быць перайменаваны ў Віленскае Ваяводзтва.

Ведама, гэта ня мае ніякага практычнага значэньня. Але цікава другое. Дагэтуль польскі ўрад разглядаў Віленшчыну, як нейкую асобную краіну, і называў яе не ваяводзтвам, а адміністрацыйным округам, з дэлегатам ураду замест ваяводы на чале. Цяпер, як відаць, улада хоча адзначыць, што Віленшчына бязспрэчна належыць да Польшчы.

Цікава, чаму дзеля гэтага выбраны толькі цяперашні мамэнт?

1-га мая і школы. Як нас паведамляюць, у дзень работніцкага сьвята 1-га мая паліцыя абыходзіла школы і правярала, хто з вучыцялёў у гэты дзень не зьявіўся на заняткі.

Адна жыдоўская газэта падае вестку, што віленскае куратарыум разаслала ў урадовыя школы цыркуляр, каб кіраўнікі іх надалі сьпісак вучыцялёў і вучняў, якія ня былі ў школах 1-га мая без паважнае прычыны. Як відаць, куратарыум, замест займацца прасьветнымі справамі, пераатвараецца ў экспозытуру палітычнае паліцыі. Ня многа-ж яно навучыць народ!

Ад Рэдакцыі. Ужо дзьве беларускія часопісі—„Змаганьне“ і „Голас Беларуса“ — зачынены сёлета ўладаю, і ў гэты мамэнт на ўсе тры міліёны беларусаў, што апынуліся пад уладай Польшчы, выходзіць толькі адна газэта па беларуску: „Krynica“. Але „Krynica“ друкуецца лацінскімі літэрамі, дык і даступна толькі для тых беларусаў, якія ўмеюць чытаць лацінікай. Усе-ж тыя, што ня ведаюць лацінікі, асталіся бяз газэты ў роднай мове.

Пасьля зачыненьня „Голаса Беларусі“ група беларускіх пісьменьнікаў рабіла захады, каб гэтую нястачу неяк запоўніць. Аднак, тутэйшая ўлада запратэставала проці назову газэты, які быў праектаваны. Дзеля гэтага прайшло больш, чым сьлед, часу, пакуль наладзілася гэтая наша часопісь.

Імкнучыся выпускаць газэту магчыма часьцей, Рэдакцыя будзе выпаўняць гэта ў меру сваіх грашовых магчымасьцяў. Дзеля гэтага заклікаем грамадзянства падтрымаць нас грашыма, каб беларуская прэса не замірала, а ўсё буйней разрасталася.

Беларусы у Латвіі.

К. Езавітаў падаўся ў адстаўку.

Кіраўнік Дзяржаўнай Люцынскай Беларускай гімназіі К. Езавітаў падаўся ў адстаўку.

Адстаўка прынята Міністрам Прасьветы.

Новым кіраўніком да канца гэтага вучэбнага году назначаны гр. В. Пігулеўскі, які ўжо прыбыў у Люцын і з 23-га красавіка пачаў спаўненьне абавязкаў і прыём справаў гімназіі.

Наша пошта.

Ал. Завадзкаму. Два з паловай мільёны атрымалі. Газэту высылаем.

Данату Клагішу. Грошы 150 л. р. атрымалі. Газэту высылаем. Заахвочвайце да падпіскі другіх.

Гр. Рамейку. Грошы 15 мільёнаў атрымалі. Газэту высылаем.

Вінц. Грынкевічу. Грошы 6.000.000 м. п. атрыманы. Дзякуемо. Газэту высылаем.

Рэдактар-Выдавец М. Шыла.

Друкарня Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.